единств показывает, что для единств с полной прагматической связью реплик характерны следующие разновидности формально-семантической связи: рекуррентная – 35 %, инцидентная (проформы) – 11 %, эллиптическая – 10 %, функционально-коррелятивная – 8 %. В 36 % диалогических единств с полной прагматической связью реплик представлены комбинации нескольких разновидностей формально-семантической связи, причем в этих комбинациях, как правило, представлена рекурренция: на долю комбинации инцидентной (проформы) и рекуррентной связей приходится 12 %, а на долю комбинаций эллиптической и рекуррентной связей – 8 % исследованных контекстов.

Таким образом, проведенный анализ дает основания утверждать, что ведущим типом формально-семантической связи в диалогических единствах с полной прагматической связью реплик является рекуррентная связь. Можно предположить, что конфигурация разновидностей формально-семантической связи будет существенно отличаться в диалогических единствах с неполной прагматической связью, обусловливая вариативность отношений между анализируемыми типами связи.

**Н. С. Еўчык** (МДЛУ, Мінск, Беларусь)

## ВАРЫЯТЫЎНАСЦЬ І СТАБІЛЬНАСЦЬ ПРАСОДЫІ ЯК СВЕДКА ГІСТАРЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

Аб гістарычным развіцці нацыі можна меркаваць па стане самых розных і практычна ўсіх сфер жыцця. Пры гэтым разглядзе важна мець на ўвазе дзве рысы. З аднаго боку, пры параўнанні на восі часу развіццё азначае змяненне з трывалай дынамікай якасцей па іх прыкметах, з іншага боку, яно абавязкова прадугледжвае захаванне ў часе таго, што павінна быць заўсёды прысутным, каб складаць тыя асаблівыя якасці, якія сведчаць аб прыналежнасці таго, што разглядаецца, менавіта да гэтай нацыі, служыць яе ідэнтыфікацыі пры пераходзе з аднаго гістарычнага вітка на іншы. Таму гэтая другая рыса мацней за ўсё звязана з глыбіннымі, зыходнымі каранямі пачаткаў развіцця. Такія прыкметы дазваляюць народу, прайшоўшы доўгі, шматвяковы шлях, захаваць і развіць сваю нацыянальную адметнасць. Так адбываецца і з беларускай мовай на падставе яе сваеасаблівага вымаўлення. Нягледзячы на ўплыў літаратурнай мовы, лінгвістычныя асаблівасці, якія прадстаўляюць сабой генетычную і гістарычную моўную спадчыну народа, працягваюць надаваць беларускаму маўленню той асаблівы характар, які прасочваецца ў яго сучасных рэгіянальных варыянтах.

Засярэдзім нашу ўвагу на такім спецыфічным складніку мовы, які выступае прасодыя. Спецыфіка гэта заключаецца ў тым, што для прасодыі характэрна высокая ступень індывідуальнага вар'іравання. Менавіта гэта паслужыла прычынай цяжкасцей яе сістэматызацыі, і таму яна доўга не магла стаць прадметам навуковага вывучэння. Вар'іраванне прасодыі з'яўляецца яе першаснай асабістай характарыстыкай і праяўляецца ў тым, што нават адна

і тая ж асоба не здольна вымавіць аднолькава адну і тую ж фразу: яе дэталёвыя прасадычныя характарыстыкі будуць адрозніваццa. Тым не менш, выкарыстанне сучасных методык апрацоўкі моўнага сігналу дазваляе разглядаць варыятыўнасць так, каб атрымліваць яе абагульняючыя інварыянтныя даныя. Так, даследаванне прасодыі дазволіла вылучыць шэраг агульных рыс, якія ўласцівы маўленню ў лінгвістычнай прасторы Беларусі і адносна індывідуальнай вырыятыўнасці складаюць стабільны прасадычны малюнак сучаснай беларускай мовы. У гэтым заключаецца сутнасць першага вітка ўзаемападпарадкавання варыятыўнасці і стабільнасці прасодыі.

Другі віток суадносін варыятыўнасці і стабільнасці ў гэтай неад'емнай складаючай маўлення назіраецца з улікам функцыянавання тэрытарыяльных варыянтаў мовы. Зыходзячы з пазіцый яе гістарычнага развіцця нам удалося вызначыць і эксперыментальна даказаць існаванне рэгіянальных прыкмет прасодыі ў шасці найбольш буйных лінгвагеаграфічных рэгіёнах краіны: Гомельскім, Полацкім, Заходнепалескім, Гродзенска-Баранавіцкім, Усходнемагілёўскім, Мінска-Маладзечанскім. Гэты факт на фоне шырокай рэгіянальнай варыятыўнасці можна разглядаць як доказ існавання спецыфічных якасных рыс для падзелу на стабільныя прасадычныя партрэты яе трывалага захоўвання, характэрныя для кожнай пэўнай тэрыторыі краіны.

Нягледзячы на міжрэгіянальную варыятыўнасць, унутрырэгіянальная прасодыя мае стабільнасць, якая складае вышэй названую рысу захоўвання сваёй якасці. Чаму адбываецца так? Адказ на гэтае пытанне крыецца ў антагенэзе чалавека і звязан з тым, што прасодыя закладаецца чалавечаму плоду з голасу матулі яшчэ да яго нараджэння – да таго моманту, як дзіця ўбачыць свет, а потым па меры яго станаўлення замацоўваецца ў асяроддзі сям'і і грамадства і таму носіць разам з абагульняючай нацыянальнай якасцю прыкметы менавіта рэгіянальнага характару. Стабільнаць характарыстык у кожным рэгіёне назіраецца настолькі трывалая, што перадаецца ад папярэдняга пакалення наступным. І дзеля гэтага дастаткова ўжываць родную мову ў сваім блізкім асяроддзі, нават калі астатняя частка грамадства карыстаецца іншай мовай. Аб тым, што менавіта так ідзе рух гістарычнага развіцця нацыі, сведчыць наша даследаванне прасодыі на матэрыяле Гомельскага і Полацкага рэгёнаў Беларусі. Яны былі абраны для даследавання па прычыне існавання палявых магнітафонных запісаў 60-х гадоў мінулага стагоддзя, захаваных у архівах Нацыянальнай Акадэміі навук. Гэтыя запісы ў свой час былі створаны беларускімі навукоўцамі і выкарыстаны імі для вывучэння рэгіянальнай мовы на ўзроўні яе сегментных характарыстык. На сёння, калі прыйшоў час зрабіць прадметам навуковага даследавання рэгіянальную прасодыю, гэты матэрыял мае для нас гістарычную каштоўнасць.

Так, згодна з праведзеным комплексным (аудытыўным, акустычным і перцэптыўным) эксперыментам, накіраваным на параўнанне супрасегментных рыс маўлення старэйшага і маладога пакаленняў у даследаваных рэгіёнах, выяўлена наяўнасць агульных найбольш спецыфічных тэрытарыяльных прыкмет у маўленні дзвюх узроставых груп іх жыхароў. Выяўленыя асаблі-

васці пацвярджаюць вынікі ўсяго даследавання, даказваючы маркіраванасць Гомельскага і Полацкага рэгіёнаў адметнымі для кожнай тэрыторыі прасадычнымі характарыстыкамі, падобнымі ў маладога і старэйшага пакалення беларусаў. У цэлым эксперыментальныя даныя ўсімі сваімі паказчыкамі сведчаць аб захаванасці тых рыс прасодыі маўлення, якія былі ўласцівы даследаваным рэгіёнам у сярэдзіне ХХ стагоддзя, і аб іх устойлівым праяўленні ў рэгіянальным вымаўленні маладога пакалення на пачатку трэцяга тысячагоддзя.

Такім чынам, атрыманыя даныя даюць падставу сцвярджаць існаванне той стабільнасці прасодыі, якая як вертыкальны замацавальны стрыжань прасякае і жывіць два першыя вiткі, дзе функцыянуе яе варыятыўнасць: спачатку рэгіянальнай мовы, каб захаваць кожную з іх як аўтэнтычную і каб адначасова з гэтым даць той матэрыял, які служыць для стварэння другога віткагістарычнага развіцця – гучання сучаснай беларускай літаратурнай мовы з яе агульнанацыянальнымі рысамі, якія прадстаўляюць тэрытарыяльнае адзінства нацыі і адлюстроўваюць яе цэласную лінгвістычную непаўторнасць.

Для факталагічнай доказнасці прадстаўленых сцвярджэнняў прыводзяцца прыклады, малюнкі інтанаграм і графічныя ілюстрацыі з лічбавымі паказчыкамі атрыманых эксперыментальных даных.

**Е. Г. Задворная** (МГЛУ, Минск)

## ВАРИАТИВНОСТЬ КОММУНИКАТИВНЫХ РЕАКЦИЙ НА НЕГАТИВНООЦЕНОЧНЫЕ СУЖДЕНИЯ В НАУЧНОМ ДИАЛОГЕ

Кооперативность и толерантность, будучи ведущими принципами речевого поведения субъектов научной коммуникации, тем не менее не могут заблокировать возможности актуализации в научной полемике негативнооценочных суждений различного типа и различной степени интенсивности, ср. следующие фрагменты дискуссий, участники которых демонстрируют впечатляющую степень резкости и категоричности своих оценок:

*– Я думаю, что,* ***если бы современные школьники и учителя прослушали вашу лекцию, они бы полностью потеряли вкус к Тургеневу, который у них, может быть, когда-то существовал****;*

*– Так вы видели живого практикующего человека?*

*–* ***Это очень тупой вопрос****. Повторяю, традиция жива и существует сегодня, в не самом худшем своем периоде, во всем православном мире, как она существовала в иные столетия.*

Если факторы актуализации таких высказываний и их семантико-прагматические характеристики не раз обсуждались в работах, посвященных научному дискурсу, причем преимущественно применительно к ядерным монологическим жанрам научной речи, то способы реагирования на негативную оценку в научном диалоге пока не получили достаточно глубокого